15. Ганчарык, М.М. Шлях ад пачатку стагоддзя: успам. / Уклад., прадм., камент. М. Токарава. – Мінск : ННАЦ імя Ф.Скарыны, 2003. – 290 с.

16. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004.–670 с.

17. Володина, Т.В. Мифологический статус и ритуальные функции леса в народной медицине белорусов / Т.В. Володина, В.А. Лобач // Этноботаника : растения в языке и культуре / Отв. ред. В.Б. Колосова, А.Б. Ипполитова. (ACTA LINGUISTICA PETROPOLITANA. Труды Института лингвистических исследований РАН / Отв. редактор Н.Н. Казанский. – Т. VI. Ч. 1). – СПб. : Изд-во «Наука», 2010. – С. 190–199.

18. Седашев, Я.Н. Лесное хозяйство в Белорусской Советской Социалистической Республике / Я.Н. Седшев. – Минск : Нар. ком. землед. ССРБ, 1923. – 15 с.

19. Седашев, Я.Н. Богата ли Белоруссия лесом? / Я.Н. Седашев. – Гомель : Тип. «Полеспечать», 1928. – 16 с.

20. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 48. – Оп. 1. – Д. 287. Переписка с отделами Наркомзема и др. учреждениями и организациями БССР по хозяйственным, финансовым и др. вопросам сельского и лесного хозяйства. Протокол заседания съезда лесоводов и представителей уездземотделов от 31 авг. 1920 г. Протокол заседания коллегии лесного отдела от 25 января 1921 г.

21. Из декрета Второго Всероссийского съезда Советов рабочих, солдатских и крестьянских депутатов "О земле", 8 ноября 1917 г.// Советская лесная экономика. Москва-Север. 1917-1941 гг. : сб. док-в и мат-в / сост. В.Г. Макуров, А.Т. Филатова. – Петрозаводск, 2005. – № 1. – С. 11.

22. О лесах: Декрет СНК РСФСР, 27 мая 1918 г. // Сб. узаконений и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства РСФСР. – 1918. – № 42. – Ст. 522.

23. НАРБ. – Ф. 48. – Оп. 1. – Д. 344. Отчёты управлений землеустройства, водного хозяйства и мелиорации, Главного управления народными имениями, Лесного управления, отделов Управления земледелия, ветеринарного, Центроземсклада, Белорусской агрономической станции, Минской опытной болотной станции о работе за январь – октябрь 1922 г. и планы работ на 1923 г.

24. Міхасенка, Е. Лясы мясцовага значэння на Беларусі і карыстанне імі / Е.П. Міхасенка. – Мінск : Белдзяржвыд, 1929. – 34 с.

25. Седашев, Я.Н. Отпуск леса трудовому населению в Советской Социалистической Республике / Я.Н. Седашев. – Минск : Изд. Упр. лесами Наркомзема БССР, 1925. – 50 с.

26. Зональный государственный архив в г. Полоцке. – Ф. 288. – Оп. 1. – Д. 4. Борковичское лесничество Полоцкого окружного земотдела. Руководящие материалы и переписка о личном составе лесничества, борьба с лесонарушениями и др. 1925 1926 гг.

27. Волчков, В.Е. Влияние разного светового режима на рост и развитие черники в условиях культуры / В.Е. Волчков, Т.Р. Моисеева, И.В. Маховик // Проблемы лесоведения и лесоводства : сб. науч. тр. ИЛ НАН Беларуси. – Вып. 70. – Гомель : Институт Леса НАН Беларуси, 2010. – С. 5–11.

28. Беларусы : у 8 т. – Т. 1 : Прамысловыя і рамесныя заняткі / Рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, В.С.Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 351 с.

29. Шумскі, К.А. Традыцыйныя экалагічныя веды беларусаў у XIX – пачатку XXI ст. / К.А. Шумскі. – Мінск: БДАТУ, 2011. – 192 с.

30. Шумскі, К.А Мясцовая фауна ў традыцыйнай культуры беларусаў (XIX – пачатак XX ст.) / К.А. Шумскі // Вес. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2007. – № 1 – С. 15–20.

31. Полацкі этнаграфічны зборнік / Уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – С. 368.

УДК 398.3

СТАТУСНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ МУЖЧЫНЫ-ЗНАХАРА Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ (ПАДЗВІНСКАЯ ТРАДЫЦЫЯ НА АГУЛЬНАЭТНІЧНЫМ ФОНЕ)

д-р філал. навук, дац. Т.В. ВАЛОДЗІНА
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск

Прадстаўлены аналіз статусных характарыстык асобы мужчыны-знахара ў тардыцыйнай культуры беларусаў, а менавіта: пол, як скалдальнік сацыяльнага статуса, амбівалентасць сілы/ведаў знахара, узаемаадносіны з прыродным светам, далучанасць яго да царквы, вера, ахрышчанасць, рамесная дзейнасць і сацыяльныя аспекты статусу знахара.

Падрыхтаваны ў рамках гранта БРФФИ-РГНФ «Традиционный культурно-языковой ландшафт белорусско-русского (Витебско-Смоленского) пограничья XX – начала XXI в.: символика фольклорных образов, ритуальные функции и их коммуникативные репрезентации», дамова №Г14РП-003.

Знахарства – адзін з найбольш складана арганізаваных фрагментаў традыцыйнай культуры, які знаходзіцца на перасячэнні міфалагічных уяўленняў і сацыяльных практык грамадства. У сусветнай гуманітарыстыцы вывучэнне знахарства вядзецца даўно і мэтаскіравана і ўжо прынесла шэраг цікавых вынікаў. У савецкай навуцы вера ў чарадзейства асэнсоўвалася як забабоннасць і цёмень неадукаванага народа, адпаведна, хоць колькі сур'ёзнага сацыялагічна-культуралагічнага вывучэння ўяўленняў пра знахароў не праводзілася. Аднак апошняе дзесяцігоддзе вызначаецца як пераломнае ў тым плане, калі выходзіць шэраг прафесійных выданняў, прысвечаных феномену чарадзейства, знахарства і таемным ведам увогуле. А вось у нашай краіне даследаванні ў гэтым кірунку толькі пачынаюцца, тут варта адразу ж прыгадаць дысертацыйную працу У.А. Ганчара [1]. Знахарства як фрагмент традыцыйнай культуры прааналізавана тут зусім у новай плоскасці, калі сталіся актуалізаванымі тыя аспекты праблемы, якія да гэтага часу практычна не падымаліся. У папярэдніх працах, калі і заходзіла гаворка пра знахара, адно побач з дамавіком і русалкай, а ўжо ніякім чынам не як пра сацыяльны статус, іманентны структуры вясковай грамады.

Расійская даследчыца В.Б. Хрыстафорава прапануе адрозніваць два розныя параметры сацыяльна-камунікатыўнай прасторы вёскі – статус і рэпутацыю. Пад статусам разумеецца стандартны набор «ячэек», звычайна замацаваны ў «агульных ведах» традыцыі, у прыватнасці, у моўных і фальклорных клішэ, пад рэпутацыяй – суадносіны клішыраванага статусу і канкрэтнага чалавека з яго асаблівасцямі. Калі статус вызначае стандартныя адносіны да свайго носьбіта, то рашаючае значэнне будзе мець менавіта яго рэпутацыя. Паколькі сельскі соцыум знітаваны доўгатэрміновымі адносінамі сваяцтва, суседства, то ўнутраныя стратэгіі паводзінаў у ім вызначаюцца як статусам, так і рэпутацыяй, але перадусім рэпутацыяй. У пэўнай ступені таму асобныя статусныя характарыстыкі набываюць амбівалентныя рысы, прыкладам, «багач» і «бядняк» могуць ацэньвацца як сквапны і лянівы, а могуць і пазітыўна – першы як добры гаспадар і другі як не хапун: ацэнка будзе залежаць ад асабістай рэпутацыі чалавека) [2, с. 23]. Істотнай падаецца ўвага якраз да рэпутацыі вясковага знахара, што выбудоўваецца на падставе аповядаў пра кожнага канкрэтнага носьбіта таемных ведаў.

Факталагічная база для вывучэння знахарства ў нашай краіне вельмі і вельмі прадстаўнічая, і кожная экспедыцыя папаўняе гэтую базу новымі, падчас унікальнымі запісамі. У аповядах вяскоўцаў пра знахароў, асабліва ў павер'ях і тэкстахняказкавай прозы, міфалагічнае і сацыяльнае пераплецены так, што фокус іх разгляду ўвесь час вагаецца між абодвума бакамі і таму натуральна змяшчаецца ў тую прастору, якую Кліфард Гірц назваў «сацыяльнай семантыкай». "Гэты тэксты могуць быць разгледжаны не толькіяк актуалізацыя міфалагічнай «карціны свету», але і як мадэлі, што адначасова і адлюстроўваюць сацыяльную рэальнасць, і выкарыстоўваюцца для канструявання гэтай рэальнасці" [2, с. 4]. У дадзеным выпадку увага акцэнтуецца на Падзвінні, аднак уяўленні пра знахароў падаюцца ў шырокім агульнаэтнічным кантэксце. Варта толькі агаварыцца, што для людзей, якія практыкуюць дапамогу людзям праз зварот да звышнатуральнага, на Падзвінні існуе шэраг сінанімічных найменняў: знахар(-ка), шаптун(-уха), дзед/бабка. Уіншых рэгіёнах Беларусі карціна з найменнямі можна значна адрозніваца. Наогул, сёння назіраецца значнае перамяшэнне тэрміналогіі людзей Веды. Як паказвае тое У.А. Ганчар, замацаваная ў сённяшніх умовах дуалістычная тыпалогія "знаючых" з падзелам носьбітаў эзатэрычных ведаў на калдуна і знахара заснавана на кніжнай традыцыі і мае вытокі ў Заходняй Еўропе [1].

Знахарства – асаблівы лёс і біяграфія, асаблівы статус доўгу. У руках знахара не толькі жыццё і смерць пацыента так бы мовіць фізіялагічныя, але перш за ўсё духоўныя. Наўпрост улучаны ў сацыяфізічны свет і яго праблемы, у аповядах прадстаўнікоў Традыцыі знахар паўстае як носьбіт народнае мудрасці і магічных ведаў, не проста вясковы аўтарытэт, але праўдзівая Асоба, падтрыманая Небам. Знахар як канкрэтная асоба ў вясковым соцыуме дагэтуль займае там сваю, пэўную нішу. Адносіны да яго і яго вобраз у вачах аднавяскоўцаў сфарміраваліся, апроч увагі да яго асабістых якасцяў, у рэчышчы статусных характарыстык знахара ў цэлым, у кантэксце ўяўленняў пра сусвет і месца чалавека ў ім. Вызначальнай выступае вера ў тое, што знахар валодае эзатэрычнымі ведамі і можа ўздзейнічаць на ход падзей, на здароўе і можа нават карэктаваць лёс чалавека.

1. Пол як складнік сацыяльнага статуса. Пол і сіла. Адным з вызначальных крытэрыяў статусу знахара ў колішняй, ды і ў сучаснай вёсцы, выступае полавая прыналежнасць. Мужчыны-знахары, ва ўяўленнях, традыцыйна надзяляюцца большай сілай. Падобнае разуменне адсылае да дыскусіі, вядомай яшчэ з часоў Эванса-Прычарда, пра два віды знахарства – мужчынскую чорную магію, якая скарыстоўваецца найперш пры статуснай барацьбе, і жаночую ўнутраную белую моц, якая знаходзіць выйсце ў штодзённых жыццёвых клопатах. Нямецкая даследчыца Э. Лабові на падставе аналізу еўрапейскіх працэсаў прыходзіць да высновы: "Магічныя сферы і дзеянні, у якіх актыўна або пасіўна былі задзейнічаны мужчыны, былі многа больш моцнымі, чымсьці ў жанчын, арыентаваны на сялянскую

штодзённасць і на гарызонты вопыту вясковай і сямейнай супольнасці. Мужчынская магія была хутчэй "па гэты бок арыентаванай" і ўсвядомленай, чым дэманічнай і таямнічай магчымасцю вытлумачэння свету і жыццёвай тэхнікай, а яе магічныя магчымасці часцей складаліся з натуральных, магізаваных праз рытуал частак і залежалі хутчэй ад зямнога, чым ад замагільнага свету" [5, s. 62]. Беларуская колішняя традыцыя калі і не пацвярджае дадзенай высновы цалкам, то ўсё адно кладзецца ў пэўнае размежаванне двух відаў магіі.

Спецыфіку мужчынскай разнавіднасці магічных ведаў як у рэфлексіях інфармантаў, так і ў навуковым дыскурсе больш за іншае характарызуе паняцце «сілы». Маркёр «сільнага знахара/чараўніка» вылучае асобу з асаблівым сацыяльна-міфалагічным статусам і выразна адрознівае яго ад бабуль-шаптух. "Сіла ў мужчыны ёсь крапчэйшая"[1]. *"А яны толькі шэпчуць ці ўмеюць і дрэнная?* – Што хочаш. Умеюць і дрэнная. У нас дзед адзін быў, зь ім ніхто не зьвязаваўся, ён умеў і паддзялаваць, і аддзялаваць. Мог так паддзелаць, што…Мужык шчытаецца сама сільны"[2], "Так, што сіла ён быў, сіла быў. І дочка была. Наверна, ей было перадана. Тожа ваду давала от і до. Цяпер можа разрашаюць, а тады было запрыпшчона… – *Вот эты Іван, ён толькі падрабляў, ці і памагаў?* – Памагаў, памагаў. Зьдзелаіць што хочаш. Памагаў сільна. – *Мог зрабіць і адрабіць?* – Да. Памагаў, крэпка памагаў. А такога можа зьдзелаць, і забалеіш, і памрэш, і што хочаш. У яго была сіла, сіла"[3].

Маркёр "сіла" ў дачыненні да чалавека Ведаў улучае такія складнікі, як "дар", які перадусім разумеецца як Божы дар (гл. ніжэй), практычныя веды ў сферы чалавечай анатоміі і медыцыны, а таксама прароцкія здольнасці. "Кліенты" прарочы дар знахара падкрэсліваюць асобна і па дзвюх лініях: першая – уласна дыягностыка хваробы і патэнцыйнага вінаватага, а другая – публічнае вылучэнне таго, каму найперш патрабуецца дапамога. "У мяне быў такі случай. Малы быў, і крычыць, і крычыць, і няма рады, усе мы яго носім на руках, пазьменна, носім і носім, а ніякай рады няма. Тады саседка параіла, што ў Грэзску быў мужчына. Ён не асоба стары. Кажа: "Паедзь к яму". Я пакінула дзіця крычучы ў мужыка на руках і паехала. А ён крычыць. Я прыязджаю туды, а ён жыў з нявесткаю, жонкі ўжо не было. Я прыходжу туды, нявестка пол мыла. Я кажу: "А дзе дзед ваш?" – "Ён пашоў за хлебам". А тут к яму столькі людзей прышло. Усякія людзі ест. Я ўзяла адзежу малому, і сукеначку, і шапачку, і вады ў бутылку, і сахару кусочак. Я ж не знаю, на што ён гамоніць. Скора гэты дзед прыходзіць. Я сама ўдзіўлялася. Тут некаторыя к яму кінуліся: "Ой, дзедачка!" А ён на мяне: "Гэта жанчына ўперад цябе прыехала і сядзіць". Во. Адкуль ён знае, што я перша прыехала?.. Паставіў гэты хлеб, прыходзіць і на мяне будзе казаць: "Я вашага малога бачыў". Яму не нада казаць, з чым ты прышоў. Што ў малога там такое, яму гэта не нада казаць, ён сам знае. Будзе казаць: "Я вашага малога бачыў, што вы ўзялі з сабой?" Я кажу: "І адзежу во ўзяла, і воду". Ён бярэ з сабой эту адзежу і пашоў, пашоў, а ў яго там спецыяльна комната, дзе ён гамоніць. Пашоў, даўгавата яго не было, а тады прыходзіць, а адзежа скамечаная ўся, скамечаная. Будзе на мяне казаць: "Ваш малы сьпіць. Да, ваш малы сьпіць, я яго бачыў". Ён мне сказаў, што там рабіць. Я прыехала дадому, а мой малы сьпіць. Мужык кажа, што як заснуў ён тады, як я прымерна прыехала, і суткі не прасынаўся. Спаў. І вы знаеця што, і памог, што рукамі адняло"[4].

"А есць знахары. У нас быў у Сарачах у Любанскім знахор, дзядзька, такі высокі. Маей сястры было нешта зрабіласа, яна ж яшчэ маладая была, павёз мужык яе к таму. Яна яшчэ да абеда нічого, а пасьля абеда: "Я памру, у мяне ў сярэдзіне ўсё паўсыхало. Я памру, і ўсё". І на мяне: "Ты давольна, табе ўсё паастаецца". Ён яе павёз к таму знахару. Мы толькі як заехалі, яна расказывала, ён толькі глянуў на мяне, той дзед, і кажа: "Ну што, прышла саседка, дажа ваша росцьвенніца і пасыпала ў варотах пяском з магілы, а ты ўступіла. Яна не злоўмышленна табе зрабіла, а папракцікавалася". Ці можа такоя быць… І ён зрабіў ей вады. Раньшы ж лаўкі былі. Ён так зразу ўзяў нажа і ў лаўку ўдзяўбнуў. І начаў расказываць пра эта. І сказаў: нікаму нічога не давай тры дні, але тая жанчына прыдзе. Хоць ты ей у вочы плюй, будзе ісьці. Яны не ўсьпелі прыехаць, а яна ўжо прыехала. І слава Богу, паправілася. – *Эты дзед лячыў?* – Лячыў. Ён памёр, а ў яго быў сын-інвалід. Дзеўкі, такі інвалід, што хай Бог не дае нікому. Ён і ішоў як нечалавек, і галава набок, і рукі як капыты ў каня, і сьліна цякла з рота, а гаварыў, яго толькі разьбірала маці. Ён перадаў сыну. Як той сын лячыў! І адсюль езьдзілі людзі! Ён бярэ твой ці платок ці майку і ідзе глядзець, глядзець недзе, кажуць, на заклад. Ідзе глядзець. Прыдзе ў хату, усе на сьвеце табе скажа. І ад

[1] Зап. у 2007 г. Валодзіна Т. у в. Серкавіцы Талочынскага р-на ад Ермаловіча Васіля Аляксеевіча, 1919 г.н. і Ермаловіч Антаніны Яфімаўны, 1924 г.н. Далей, калі збіральнік не пазначаецца, запісы аўтара – Валодзінай Т.
[2] Зап. у 2013 г. Валодзіна Т. і Кухаронак Т. у в. Ляжынка Быхаўскага р-на адПермінава Віталя Іванавіча, 1958 г.н.
[3] Зап. у 2008 г. Валодзіна Т. і Лобач У. у в. Добрыгоры Бешанковіцкага р-наад Лужніковай Фаіны Дзмітрыеўны, 1927 г.н.
[4] Зап. у 2010 г. у в. Цераспаль Слуцкага р-на ад Ковчур Лідзіі Фёдараўны, 1928 г.н.

чаго і што і як зрабіласа. Дзяўчаты мае залатыя, таго інваліда забіралі ў Мінск. У лётную часць. І там ён многа многа памагаў людзям. А яны яго спаілі і ён памёр. Грошы набралі і спаілі. Маці плакала, а так ён не піў, нічога. Што знаў, то знаў"[5].

2. Амбівалентнасць сілы/ведаў. Найпершай вызначальнай светапогляднай ідэяй пры аналізаванні статуса знахара становіцца разуменне дваістай прыроды любых сакральных ведаў, што пацвярджае неапраўданасць аднабаковага і катэгарычнага ўспрымання асобы знахара. Інфармант М. Федароўскага адзначае, што, «кожны знахар то ёсць так добро як вядзьмар, бо кожны з чортам знаецца, але не ва ўсякага з іх злапамятнае серца, то людзям памагае» [4, s. 101], у Ч. Пяткевіча чытаем пра вядомага ў Рэчыцкім павеце знахара: «Ось, недалека шукаючы, калісь атаман Мірон быў вялікі знахар, хадь і вялікі грэшнік, бо быў чараўніком, Господзі яму прасьці на том сьвеці. <...> Затым то ён быў багаты, да, знаючы ўсё добрае і ліхое, зла нікому не чыніў, як робяць другія чараўнікі за чарку або за грошы; яго яшчэ звалі адрабляць усялякае чартавінне» [5, с. 487–488]. Больш карэктна лекарскія здольнасці чарадзеяў фармуляваць так: яны спецыялізаваліся на лекаванні хваробаў, звязаных з напушчэннем псоты, сурокамі і г.д., словам, з тымі, дзе прычынаю станавілася парушэнне міжсветавых межаў, шкоданоснае ўздзеянне аднаго на другога. Будзённыя хваробы тыпу рожы ці падрыву лекавалі іншыя "адмыслоўцы": "*А ці ўмелі тыя калдуны ці чараўнікі лячыць?* – Умелі, умелі. Яны зьдзелаюць і аддзелаюць. Вот сходзіш к яму, як знаіш, хто табе зьдзелаў, папросіш, ён і аддзелаіць. – *Ну а вот рожу, ці эта тожа чараўнікі лячылі ці атдзельна якія людзі?* – Ага, эта аддзельна загаравалі, і рожу, і з пуду, і ад залатніка"[6]. "У Забор'і быў тожа мужчына. Дык ён тожа панімаў, і лячыць панімаў, і здзелаць мог. Ну к яму ездзілі, і з далёкага, усякія былі. – *А што ён дрэннага мог здзелаць?* – На каго сярдзіт, паддзелаіць, той чалавек мучаецца тады"[7]. "Былі чараўнікі, што ўмелі чараваць. Гаворуць: такія, што бяжыць карова і кішкі цянуцца, а пазавуць чараўніка, той прыдзіць, абойдзіць кругом, пастукаіць, паляпаіць і ўсё харашо. Такія былі. У Падрэзах было чалавекі тры. – *А гэта мужыкі былі?* – Мужыкі, нашчот баб чараўнікоў я ня чула. – *А яны робілі і добрая і дрэнная*? – Ня трогай яго, дык ён табе нічога дрэннага ня зробіць. А еслі не па-ягонаму, то ўсяк можаць. Эта даўно было і можа ніпраўда. – *А лячылі яны? Ці эта былі атдзельныя людзі?* – Яны і лячылі. Ён зачаруіць, ён і атчаруіць. Есьлі ён паддзелаіць, то ніхто не паможаць, толькі ён і аддзелаіць. Еслі яго пазваць, угасціць, пагаварыць і з ім, тады будзіць усё ў парадку. – *А хто яму памагаіць, Бог ці чорт?* – А хто яго відзіў, ці таго Бога, ці таго чорта?.."[8]

Шэраг запісаў дазваляе зрабіць наступную выснову: калі гаворка ідзе пра славутага лекара, то здольнасці яго да "паддзелу", "чаравання" ў абсалютнай большасці адмаўляюцца, прычым нярэдкія сцвярджэнні тыпу "хто з Богам, дрэнная ня ўмеець". У той жа час у аповядахпрамоцных "калдуноў" сустракаецца і ўменне яго лекаваць хваробы.

У асобных вёсках іх наогул не падзяляюць катэгарычна:

– *Раскажыце пра тых людзей, што лечылі? Ці яны толькі лечылі ці маглі і абы-што робіць?*

– Маглі і абы-што.

– *Эта адзін і той жа чалавек?*

– Да, да. Мог і добрая і ўсякая. У нас была бабка, дык яна дужа добра давала ваду. Ей мой свёкар перадаў. Мы па саседству жылі. Вот ідуць каровы. Еслі яна стаіць на вуліцы, то я ўжо сваю карову не падаю. Так было. Яна мне нагой як дась, падаіць не сумею. Прыхаджу ў хату. Папа, – да свёкра, – карова кідаецца. Ён пойдзець у сарай, што ён там дзелаець. Не знаю, можа, загавараваіць. А тады прыдзіць: Ну, ідзі, – кажаць. Разоў сколькі так было. Як увідзіць карову – всё. Тады ўжо я к карові не падыйду, ка мне з рагамі.

– *А вот вы гаворыця, перадаў, эта можна толькі аднаму чалавеку?*

– Канешна, канешна. Эта нада быць дужа такім... памятлівым... такім... Мой свёкар хацеў майму мужыку перадаць, а мужык быў парційны, не захацеў.

– *Ці казалі, што тыя калдуны цяжка паміраюць?*

– Эта калі не перададуць, тады цяжка. А яна перадала мужыку, ехала на аперацыю і перадала мужыку. Баялася, што будзець цяжка, можа, і перадала мужыку. Цяпер ён загавараваіць і ад пуду, к яму дзяцей прывозюць"[9].

[5]Зап. у 2010 г. в.Лядна Слуцкага р-на ад ДавыдчыкВалянціны Андрэеўны, 1938 г.н.
[6] Зап. у 2006 г. у в. КугоніУшацкага р-на ад НадзеіКанстанцінаўныСаўковіч, 1926 г.н.
[7]Зап. у 2008 г. у в. Вяжышча Бешанковіцкага р-на ад Брадзінскай Ганны Кузьмінічны, 1925 г.н.
[8]Зап. у 2007 г. у в. Падрэзы Чашніцкага р-на ад Катульскай Ніны Сцефанаўны, 1938 г.н.
[9] Зап. у 2007 г. у в. ПадрэзыЧашніцкага р-на ад ПадрэзНадзеіЛеанідаўны, 1940 г.н.

Нікіпар са Жлобінскага р-на, які "ездзіў і па Украіне, яго як урача вазілі, вызывалі, ён паедзе і паедзе", міжтым, у аповядах, не грэбаваў і хаўрусам з нячысцікамі – "Быў калхоз. А ў яго там стаяла пуня і еўня, у еўні ён тапіў, лён сушыў. Ён тапіў еўню, а к яму прышлі нячысцікі. Да. Прынеслі яму мацерыю нейкую, ён адтуль ад іх чуць выскачыў. І з таго не стаў лячыць, ні добрага, ні плахога. – *Дык такія калдуны ўмеюць і лячыць, і дрэнная робіць?* – Еслі дрэнная табе хто-та здзелаў, то можа лячыць, а еслі ён сам, то ён должан сам узяць на сябе, што ён гэта здзелаў. Патаму не. – *А ён большы дзелаў добрага, чым дрэннага?* – Больш добрага"[10].

Разам з тым амбівалентнасць ацэначных характарыстык знахара з часам церпіць пэўныя змены, якія выражаюцца ў іх паступовым развядзенні між каштоўнаснымі полюсамі. Так, калі збіральнікі-класікі рэгулярна фіксавалі здольнасці такога чалавека да рознаскіраваных дзеянняў, то сёння ўсё часцей чуеш пра чараўнікоў, што чаруюць, і шаптуноў, што лечаць ды адрабляюць.

3. Знахар і прыродны свет (камунікацыйныя стратэгіі ў гендэрным супастаўленні). Менавіта знахар у традыцыйным соцыуме паўстае асобаю, больш шчыльна і арганічна знітаваным з прыродаю, светам у цэлым. Гэта чалавек, што разуме мову жывёл, траў і птушак. Мікалай Мікітавіч з Забор'я Расонскага р-на, па словах яго дачкі, "любіў лес, работаў у ляснічыстве. Ён прыдзіць к любому дзераву і меня вадзіў: бяроза – ён разгаварываіць з ей, і я знаю; ліпа – з ліпай разгаварываіць. Стаіць дуб – з дубам разгаварываіць. І я эта знаю, і яму атвет быў. Ага, я з сямі гадоў. Ён сільна лес любіў, прыроду любіў, нічыво так не любіў, як лес любіў"[11]. Як заўважаў У.А. Лобач, "досвед гэтага знахара выразна карэлюецца з таемным дарам усёведання, які, паводле шырока распаўсюджанай на Беларусі легенды, атрымлівае чалавек, адшукаўшы ў лесе Папараць-кветку: "У той жа момант стаў ён усёведным: знайшоў прапаўшых коней, даведаўся, дзе схаваны скарб, як трэба бараніцца ад чараў ведзьмаў" [6, с. 151]. І ў сучасных запісах: "Калі найдзеш папараць-кветку, то будзеш усё знаць на зямлі, будзеш ужо знахарам бальшым. А яшчэ мама казала, што нада разрэзаць руку і зашыць яе і тады што хочаш, махні рукой і ўсё табе раскрыецца"[12].

У своеасаблівае падпарадкаванне знахару трапляюць шматлікія жывыя насельнікі прыроды, ад акультураных пчолаў з іх найвышэйшым семіятычным статусам да вужакаў як выразных прадстаўніц хтонасу.

3.1. Знахар – пчолы. Неаднаразова падкрэсліваецца асаблівая ўдачлівасць і спор у развядзенні пчолаў, але, што найбольш цікава, улада гэтага мужчыны над імі самімі, замаўленне, каб не кусалі. "Пчолы. Яны самі к нам ляцелі! Стока было пчол, людзям мёд давалі. Стока было пчол. Ой, што гаварыць табе! Ага, панімаў і як, аж пчолы ўжо кругом абстаўлены. Прыдуць людзі посля вайны, сталі балець, ні ў кога нічога не браў. Накладаіць: "На, мядку паеш". Вот такі ён: "На, паеш мядку. Што ёсць, на, тое пакушай". Нікаво ня выпусціць, каб не спрасіў, ці хочыш ты"[13]. "У мяне Ліда была малая, годзік ёй, а ў нас пчол было многа, пятнаццаць калод. Дык, бывала, пайдзець туды ў пасеку, а яна за ім туды пріпаўзець – нікада не ўкусілі пчолы. Гэта ж так усё знаў, што дзіцёнак сядзіць і нікагда. Я первы раз крічэла і выла, думала, што дзіцёнак у калодзец ускачыў, пасабраліся ўсі саседзі шукаць. А ён: "Танечка, а во яна, не плач". Пріхаджу, а яна ў яго на каленях, ля пчол"[14]. «У майго хазяіна быў дзед, дак у яго было тры сыны, і ён сільна знаў, сільна знаў, дык у яго было столькі пчол, што ніхто і не зачэпіць яго, а еслі зачэпіць, скажа ён, дык будзеш век калекаю поўзаць» [7, с. 119].

3.2. Знахар – жывёла. У сферы дачыненняў са светам жывёл назіраецца тэндэнцыя да дыхатаміі шаптун – чараўнік па прыкмеце кіравання ваўчынай зграяй. Улада над ваўкамі для знахара распаўсюджвалася адно на абарону ад драпежніка свойскай жывёлы, але не на насыланне ваўкоў ці іх выкліканне. Гл. зварот да ваўкоў у замове: "Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся. Матка Прачыста, стань ка мне на помач, ангелам на радасць. Загаварываю рабу Божаю скацінку, бураю шарсцінку. Станаві яе ў поле і лесе пнем, у балоце каменем. Ваўкі Аксен, Максен, Аксіння, Прасіння, прасіце Госпада Бога. Станаві яе ў поле і ў лесе пнем, у балоце каменем. Лес, мой лес, лес чысты, лес пракрасны, перадаю вам ўсім паклон"[15]. Яшчэ ў другой палавіне XIX ст. Ю. Крачкоўскі адзначаў, што ў многіх вёсках пры першым выгане жывёлы «*знахары*» праводзяць спецыяльныя абрады «*зацінання*», каб прадухіліць няшчасныя выпадкі з жывёлай, асабліва смерць ад драпежнікаў. Далей даследчык паведам-

[10]Зап. у 2009 г. у в. Старая Рудня Жлобінскага р-на адАнікеевайВалянціныРыгораўны, 1921 г.н.
[11]Зап. у 2009 г. Валодзіна Т. і Лобач У. у в. Забор'еРасонскага р-на ад Лісічонак КсенііМікалаеўны, 1928 г.н.
[12]Зап. у 2010 г. у в. Сцяпы Жлобінскага р-на ад Шаўцовай Валянціны Сяргееўны, 1936 г.н.
[13]Зап. у 2009 г. Валодзіна Т. і Лобач У. у в. Забор'еРасонскага р-на ад Лісічонак КсенііМікалаеўны, 1928 г.н.
[14]Зап. у 2012 г. Валодзіна Т. і Антропаў М. у в. Забялышын Хоцімскага р-на ад Андрушкінай Таццяны Нікіцьеўны, 1920 г.н.
[15]Зап. у 1991 г. Лапацін Г. у г.п. Ветка ад перасяленца з в. Сівенка Шапавалава Мікіты Ягоравіча, 1924 г.н.

ляе: «Як распавядалі, што пасля смерці асабліва паважаных знахароў, магілы іх сцераглі дні тры-чатыры. Гэта рабілася для таго, тлумачылі сяляне, каб ваўкі, быццам бы вельмі сярдзітыя на знахара, не адкапалі б яго магілы і не выкарысталі яго мёртвыя рэшткі» [8, с. 192–193]. «Еслі свыння заночуе [у лесе] ці карова, ён («знахар». – *Т.В.*) умее іі зацінаць. Йон ў сенцах шэпчэ, шэпчэ, патом ў стену ножа забье –і карова становіцца, і ніхто іі не троне, ні воўк, ніхто. І ўзаўтра, на другій день вунімае[нож], і карова ужэ сама прійде. Есь такій празнік –Юрэй. Таму, што ён зацінае, полные суткі даўжон посціць, нічого ён не есць, дажэ і вады. Адін день ў год толькі. Ў вечэр і перэд Юрйем павечэраець, то ужэ надругій день ў вечэрі» [9, с. 426]. "Як сьвіння была ўцякла, прапала, дзед Платон пашаптаў нешта ў комін, і тая сьвіння сама прышла"[16].

Знахарскімі ведамі надзяляліся пастухі, асноўнай магічнай здольнасцю якіх у Беларускім Палессі лічылі ўменне кіраваць статкам і ўтрымліваць яго. Так, Ч. Пяткевіч паведамляе: «Такога пастуха я ведаў у вёсцы Гарошкаў у 1869–1870 гады; звалі яго Дзед Цімох і казалі: Ён умее весьці худобу, бо мабыць нешто знае» [5, с. 54]. «*Шаптуха*» Дзенісенка Тамара Андрэеўна (1931 г.н., в. Чамярысы Брагінскага раёна) навучылася лячыць «*ляк*» ад аднавяскоўца, які быў пастухом: «Ну просто пастух. Ён тутака пас о тутака, о тутака, на балоце, ён прыходзіў да бацькі гуляць. Ну і от тое, ён кага: "У вас дзевачка, няхай навучыцца. Эта харошае дзела". Да і ўсе» [1, с. 39]. Аднак і тут жа маем на ўвазе рознабаковыя здольнасці пастуха. "Вот тут у Баравіках быў такі, ці Ігнат яго звалі. Ён хадзіў пасціў тута.

– *Дык ён пастух і ўмеў калдаваць?*

– О-ё-ёй! Сядзіць і будзець сядзець і ня будзець карова атвараваацца. Каровы ходзюць, нікуды ня пойдуць. У лес пойдзець... Што вы, такі быў чараўнік, што з абраці малако капала.

– *Дык ён цягаў тую аброць дзе?*

– Павесіць на гвоздзік і малако капаець.

– *Ну дык ён у другіх атымаў?*

– Канешне, канешне. Чаго другая карова мучаіцца, і здыхаець, і творагу здзелаць няможна было. Будзець кіпець ключам. А малако не аттапліваецца. Такіх людзей нада ўністажаць.

– Яны ўжо памёрлі.

– Хвароба іх не ўзяла! Ну а што. Пас і з цёткай, каровы ў лес пашлі, тая за імі. А ён ей: сядзі, нідзе яны ня дзенуцца. Тая аж плакаць пачынаець. Ну што вы, кароў няма! "Пад'ядуць, прыдуць". Усё, кажаць, прышло ўрэмя і каровы прышлі. Ну еслі ўжо хто яго зачэпіць, то ўжо ўсё. І кароў, і будзеш бегаць, і заморышся, і нічога будзець здзелаць няможна"[17].

Намоўленая вада для жывёлы, атрыманая ад мужчыны-знахара, уважалася за больш памоцную. "У нас дзяды такія былі, што зналі і панімалі. У нас такі адзін быў чараўнік, што дужа-дужа многа знаў этых загавораў. Я яму дужа памагала ў хазяйстве, жонка як памёрла. Ён маліўся над вадой. Загаворы дзелаў. Той вадой памачыўся, каб усё ўніз ішло. У нас каровы не вяліся. Змітрок нам даваў ваду, у бутылачку і каб у дзвярах вісела. Як чалавеку, дык нада спліхнуць, каб усё ўніз ішло[18].

3.3. Знахар – змеі. Асаблівыя повязі нітуюць знахара са змеямі – "Я і ад зьмяі умею, бацька мяне наўчыў. Вось мы ў лес ідзем з ім і паўзе зьмяя – я цікаць, бягом ходу, а ён кажа: "Птушачка, птушачка…" Тры разы скажа, бярэ зьмяю ў рукіі панёс, і яна яго не кусае" [10, с. 114, зап. ад Шэнды Ядзвігі Валер'еўны, 1943 г.н. у в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на]. Гл. тут жа "Каб ты забіла вужаку і выпіла троху крыві, дык усё будзеш ведаць, і чараваць, усё"[19].

У дадзеным выпадку паказальнай ёсць гендэрная асіметрыя, бо сярод знахарак-жанчын адсотак надзеленых дарам шаптаць ад змяі многа меншы. Ды і грэблівае, а часцей боязнае да іх стаўленне характэрна менавіта для жанчыны. "А захацела я ўзнаць ад зьмяі, думаю, можа, прігадзіцца. Ён мне расказаў. Наўчылася я. Но яе біць нельзя. Жыла я ў калхозе, пашла я сена сушыць. Вот як капнула граблям. А яна ляжыць здаровая-здаровая пад сенам. Я і гаварю: Ляжы! Я сена пашла дальшы, – гаварю, ня буду я цябе трогаць. Можа, людзям нада будзець – прігажусь. Я пашла дальшы сена разьбіваць. Ці тая зьмея, ці не тая, а яна ляжыць апяць пад валам. Усердзілася я на яе, а я іх баюсь. Я іх баюсь, я тады бягу дамоў. "Цяперь я з табой разьбяруць, як цябе не звалі, што ты там не ёсь, я цябе ўністожу!" Я граблі паламала, я яе як даўбанула, а яна была супаросная. А там зьмеянят поўна ў яе ў срядзіне. Я яе на граблі падняла, хоць і зламала чарянішча, я прінесла яе на камень, разьдзяўбала яе, гаварю: "І людзям памагаць ня буду, ну і ты

[16]Зап. у 2012 г. Валодзіна Т. і Кухаронак Т. у в. Паплавы Клічаўскага р-на ад Прастакевіч Марыі Міхайлаўны, 1932 г.н.
[17]Зап. у 2009 г. у в. Баравікі Сенненскага р-на ад Бівейніс Тамары Сяргееўны,1943 г.н., Бярговінай Таццяны Карнееўны, 1922 г.н., Скумс Марыі Яўгенаўны, 1930 г.н.
[18]Зап. у 2007 г. у в. Серкавіцы Талочынскага р-на ад Ермаловіча Васіля Аляксеевіча, 1919 г.н. і Ермаловіч Антаніны Яфімаўны, 1924 г.н.
[19]Зап. у 2001 г.у в.Дашкаўка Магілёўскага р-на ад Мядзвецкай Аўгінні Архіпаўны, 1912 г.н.

кусаць большы ня будзеш". Большы ад мяне пользы нет. І сьцішок ня помню"[20]."У меня ацец быў, ён панімаў па этых зьмеях… Я яго прасіла, штоб ён перадаў мне, када ён ўжэ паміраў, я прасіла. А ён сказаў: "Дачушка, я табе не перадам. Табе, – гаворыць, – я не буду перадаваць, но цябе зьмеі нікагда не будуць кусаць, ані будуць удзіраць ад цябе". Ён так зробіў. Ну і точна! Я сколька іх відзела – яны ат міня удзіраюць. Канешна, ён наверна словы знаў. Патаму што, раз ён мне сказаў, так што: "Я табе не перадам нічэво, а толькі цябе ані не будуць чапаць. Ты будзеш іх відзець, но ані цябе кусаць не будуць, ані ад цебе будуць удзіраць". І сказаў, што біць мне іх нільзя. Ён так і сказаў: "Табе толька іх біць нільзя". А я, што я б забіла, то мне ў лес хадзіць нельзя"[10, с. 89].

"У той жа час, для знахара, дзякуючы ўласцівым яму ведам, змеі – сваеасаблівыя вартаўнікі лясной прасторы – небяспекі не ўяўляюць, што, у сваю чаргу, вымагае адпаведнага, шанавальнага стаўлення да іх з боку чалавека. У зваротным выпадку, напрыклад забойства змяі, знахар губляе доступ у лес, і, трэба меркаваць, свае надзвычайныя веды" [6, с. 152].

Такім чынам, улада знахара ахоплівае ўсе тры асноўныя ярусы светабудовы: верх (пчолы) – сярэдзіну (жывёлы) – ніз (змеі). А сам ён такім чынам паўстае як сімвалічны падарожнік між гэтымі светамі, дарэчы тут прыгадаць і шаманскія ўяўленні адносна перамяшчэнняў уздоўж восі сусветнага дрэва. Прэзентацыя гэтай улады стае неад'емным складнікам сацыяльнага статусу знахара, бо такім чынам сцвярджае яго звышнатуральную моц і патэнцыйныя здольнасці гэтаксама ажыццяўляць уладу ў свеце чалавечым. Да таго ж дадаюцца семы адносна запазычання ў касмічных сферах здольнасцяў да лекавання і прадказанняў. У такім кантэксце ўвагу прыцягвае адзіны запіс, калі знахары надзяляюцца цікавым найменнем – *лазовыя*, што семантычна нітуе іх асобу не проста са светам прыроды, і нават не ўласна з дрэвам, але з такой жа семантычна медыятыўнай раслінай – лазою, ні травой ні дрэвам, сваім няпэўным статусам што адпавядае месцу знахара між людзьмі і звышнатуральнымі істотамі. "У нас быў доктар, Сабіла, ай, харошы, цяпер такіх дактароў няма, бывала, як хто ляжыць, ён ня можаць і кажаць: "Я тут ужо рады ні дам, нада дзе лазовыя, эта ўжо малітвы гэтыя. –Як ён назваў? – Лазовыя, каб ужо замаўлялі. – Шаптуны – гэта лазовыя дактары? – Ага, лазовыя"[21]. Улада знахара знаходзіцца як бы на скрыжаванні сацыяльнай, прыроднай і міфалагічнай прастораў.

Варта адзначыць і адчувальнасць знахара да сакральных локусаў, іх здольнасць адрозніць паміж сабой крыніцы. Дастаткова ўжо напісана і пра лес як боскі сегмент светабудовы, што выступае як сховішча надзвычайных ведаў і звышнатуральнай (сакральнай) энергіі, адкуль пазычалі сваю сілу моцныя знахары.

3.4. Перадача ведаў як пасвячэнне. У асобны блок вылучаюцца аповяды інфармантаў, у якіх яны апавядаюць пра незвычайны, сакральны, поўны глыбокім міфалагічным падтэкстам спосаб перадачы ведаў. Вядомая знахарка з Расоншчыны так апавядае пра сваё "пасвячэнне": "Я радзілася ў святой дзень, і ён (бацька) мне тока перадаў. Я када была маленькая, у нас там раньшэ яшчэ, раньшэ там стаяла цэркаў, і тая цэркаў ушла в землю. … І вот ён мяне туды вадзіў. Зваўся раней Кроўвацік. Там цвяты раслі, дарожкі бархатныя. Туды кругом былі такія, я басячком, помню, бегла. Ай-яй, як мягенька, дарожкі бархатныя такія, пушысценькія. Ну і вот прышлі мы туды, папа перахрасціўся, стаў малітвы гаварыць, ну свае там, дзе цэркаў гэта стаяла. А тады на міне і гаворыць: "А ты што слышыш?". А я гавару: "Папа, тут званы б'юць!". "Ну-ка храсціпна, – ён сказаў на мяне, учыў мяне". Я тады стала на каленечкі і гаворыць: "Станавіся на каленечкі, маліся Богу, чуеш?". "Чую, папа, чую, чую, папа, чую". – Дык і званілі там? – Да, падзямеллю я чула"[22].

Перад намі складаны акт пасвячэння, які ўлучае абавязковую хранатопную маркіраванасць: свята + месца, дзе правалілася царква, выпрабаванне на наяўнасць здольнасцяў – дзяўчынка чуе званы, рытуал у межах закона дар – падзяка і інш. Паказальна ў нашым выпадку тое, што таемныя, магічныя веды, атрыманыя чалавекам, могуць і вяртацца лесу, асабліва ў сітуацыі, калі знахар не бачыць сярод сваіх нашчадкаў людзей, вартых валодаць надзвычайнымі ведамі."У Лядна е, яна росцьвенніца майму мужыку, яе бацько знаў. Усе на сьвеце знаў. І падрабляў, і адрабляў. Вельмо прасіў сын. А сын быў у Магілёве, сама глаўным па магазінах. Той прасіў: бацько, перадай. Ён яго забраў і ў Магілёў, той слабы быў. Не, мой сынок, я перадам лесу. – *І што ён зробіў?* – Перадаў лесу. – *Пашоў у лес?* – Не, мусіць чытаў нашчот леса"[23]. "Быў чарадзей у вёсцы, касілі разам, пагляджу, а ён ляжыць і ляжыць ніц. А я так захацеў вады,

[20]Зап. у 2010 г. Валодзіна Т. і Лобач У. у г.п. Езярышча Гарадоцкага р-на ад Данілавай Антаніны Фёдараўны, 1929 г.н.
[21]Зап. у 2006 г. у в. Кромавічы Докшыцкага р-на ад Лынько Аляксандры Фёдараўны, 1916 г.н.
[22]Зап. у 2009 г. Валодзіна Т. і Лобач У. у в. Забор'еРасонскага р-на ад Лісічонак КсенііМікалаеўны, 1928 г.н.
[23]Зап. у 2010 г. у в. Лядна Слуцкага р-наад Давыдчык Валянціны Андрэеўны, 1938 г.н.

пайду, у яго глёк з вадой. Я іду: "Фёдар, Фёдар, у цябе вада ёсць?" А ён ляжыць, рот уніз упёрь. Ляжыць і крічыць: "Ухадзі скарей". Ён умеў. Гаворюць: як яму ўжо прідзя время, такая пара, ён і не рад, а яму нада куда-та выплеснуць. Кругом людзі. Ён наверна, пажалеў. Ляжыць і не дыша. Людзей пажалеў, у зямлю передаваў. Вот былі людзі"[24].

У рэчышчы наўпроставага камунікавання знахара з прыродным светам стаюць і выпадкі перадачы адмоўнай энергіі, веды на штось з раслін ці жывёл. "Мог і зробіць, што зробісься абыякі, і так мог. Ну, я чула. Раз рабяты гулялі, ён хацеў рабятам здзелаць. Ну, пажалеў рабят, гусям здзелаў – усе гусі ногі ўгору і ляжаць, і не шавелюцца. Тады пашлі папрасілі, ён гэта атробіў. Хацеў на рабят бедных зробіць, але пажалеў рабят" [10, с.77, зап. ад Бугая Васіля Тарасавіча, 1926 г.н. у в. Царкавішча Ушацкага р-на].

4. Знахар і вера. Як дэманструюць сучасныя запісы, адным з немалаважных складнікаў светапоглядных падмуркаў дзейнасці вясковай знахаркі выступае яе далучанасць да царквы, веры, ахрышчанасць. У дачыненні да знахара-мужчыны гэтае патрабаванне гэтаксама прысутнае, але ў працэнтных адносінах сустракаецца радзей. "Пазняк, ён стары маскаль быў, старавер, законнік быў крэпка. Набожны быў чалавек, уся яго ругня была толька слова "маць чэсная". Ён ні рабёнка, ні старога не абгаворыць, не пашлець цябе. Ён быў такі, прыхадзі – ён табе паследняе аддасць. Маскалі ўсякія былі, але болей культурнейшыя. Яны былі такія, у Бога сільна верылі. А нашы што, толькі вышаў з касцёла, дык ужо ругаіцца, ужо абгаварываець і таго, і таго. А ў іх – нет…"[25]. "Ну я вот жыў у Клімаўшчыне, там жыў старык адзін, ён загавор знаў змяіны. І есьлі ўкусіць змяя, ён загаворыць, вадзічкі здзелаець, разы тры вадзічкі пап'еш… Браў іх у рукі. І браў у рукі, ён… а чаго ён будзець баяцца, есьлі ён загавор ат іх знаў. У яго сын быў самы пасьледній. Ён сына хацеў наўчыць. Сын ягоны як заругаўся два разы ў Бога. Так ён і ўсё. Сказаў: "Гэта табе не пайдзёт." Гаворыт: "Ты не нічога не паймёш." Вот… Первая ў яго дачка была старшая, тожэ яна ругацца сільна ўмела, па ўсякаму. Трэба, каб чалавек верыў Богу нямнога. Во так во"[26].

Як адзін з нярэдка паўтараных складнікаў партрэта сучасных знахароў – валоданне імі адмысловай Бібліяй. "І гэта ж ня кожны чалавек можыць, як Шура памагаць. У яе старынная сіла, бацька стары ўсё гэта дзелаў і памагаў ад усяго. І ад ведзьмаў, і ад зглазу, і ад усяго памагаў. Ён умер і аддаў усю гэтую Біблію ей. Гэта не царкоўная – свая, сільная Біблія"[27]. "Эта бацюшка із даўнішняга Эвангелля перапісаў. І з даўнішняга, ішчэ і зь первага Эвангельля. Это мало-мало каму ён перапісываў. Ён і на вадзічку шаптаў і ўсегда маліўся"[28].

Сакральнасць і «боскасць» знахары могуць тлумачыць і фактам атрымання іх непасрэдна ад Бога, Божай Маці, што адбываецца ў час "сустрэч", ва ўяўленні або ў сне. Убачаныя Бог і Божая маці санкцыянуюць знахарскую практыку ужо самім фактам свайго з'яўлення або даюць падрабязныя інструкцыі. "А мне ніхто не перадаваў нічаго. Бацька мой не ўмеў і матка. Я бачыў Багародзіцу, яна ішла і трубіла ў залаты ражок.– ??? – Мне ўсе загавары у сне прышлі. Як Багародзіцу убачыў – стаў памагаць людзям" [11, с. 208].

Паказальны і выпадак доказу наяўнасці Бога шляхам "от протівного", калі сцвярджае тое чараўнік: "Тут нешта ўсё мужчыны споравалі, што Бога нет. А прышоў гэты Шалабот. А ён прышоў ды кажа… Эта ўжо мама расказывала. Мужчыны, ня спорця, я знаю, што Бог есць. Патаму што нячысты есць. А нячыстым ён рукавадзіў. У яго былі нячыстыя і чорная кніга. А нячыстымі ён рукавадзіў. Раз нячыстыя ёсць, значыць, і Бог ёсць. Ён умеў нарабіць. А адрабіць ня мог. Быў зрабіў Маньцы, а адрабіць ня мог. Яна была як сумашэдшая, бегала па полі, ой-ой. Чаго яны завяліся. Дзе-та яе вазілі. Тады адгаманілі. А то і на хату сыпала пяском, усе баяліся яе.

– *А што цяжка ўміраюць?*
– Як не адкажа каму, тады ў хаце трашчыць да ломіцца ўсё. А як перадась, тады лёгка"[29].

Такім чынам, было б неапраўданым адносіць лекавальны эфект дзейнасці знахароў толькі да боскай волі. Інфармантамі ўсведамляецца іншасветнасць лекарскіх ведаў. Прычым гэты іншасветны складнік у кантэксце цэласнага і адзінага космасу можа адносіцца і да адмоўнага, "нячыстага" яго полю-

[24]Зап. у 2007 г. Антропаў М. і Валодзіна Т. у в. Галавенчыцы Чавускага р-на ад Копелевай Валянціны Іосіфаўны, 1937 г.н.
[25]Зап. у 2008 г.Лобач У. у в. Сталіца Шаркаўшчынскага р-наад Арлюкевіча Казіміра Антонавіча, 1935 г.н.
[26]Зап. у 2008 г. Бабіч А. і Пашкевіч І. у в. Антонава Верхнядзвінскага р-на ад Іванова Аляксандра Пятровіча, 1935 г.н. р-на.
[27]Зап. у 2007 г. Лобач У. у п. Сураж Віцебскага р-наад Брылёвай Наталлі Кірылаўны, 1927 г.н.
[28]Зап. у 2010 у в.Прусы Старадарожскага р-на ад Шэшка Вольгі Мікалаеўны, 1934 г.н.
[29]Зап. у 2009 г. у в. Лютавічы Капыльскага р-на ад Захар'яшАлены Аляксандраўны, 1934 г.н., ГермановічНіны Алянсандраўны, 1922 г.н.

су. Іншымі словамі, вясковыя жыхары разумеюць, што сілы знахар мог чарэпаць і ў прадстаўнікоў нечысці, дапамогі якіх той змушаны быў прасіць у асобных выпадках. "Пра гэтага дзеда гаварылі. Там ён дачку замуж аддаваў. Гэты дзедушка. І з дачкой толька жыў. І вот гэтыя, як ужо была свадзьба, папрыхадзілі сваты, што даўна дзе во паклаліся, і ўсё. Гэта цяпер то находзім дзе-нібудзь. І гэта ж, і як стала там у хаце лётаць, дык там грымела ды стучала. Адна прачнулася старэйшая, паглядзела, ды казала: "Каты ўсе, с хвастамі былі". Ну чэрці. Гэты дзед владзеў, ён жа вызавець чарцей, і тады яны падсказваюць, што дзелаць"[30]. Больш правамоцна сцвярджаць, што знахар паўстае як асоба-пасярэднік між соцыумам і ўсёй пазачалавечай сферaю, недаступнай банальнаму ўспрыняццю. "Іншымі словамі, калі "правялікі пан дамавы" і Ісус Хрыстос, якія фігуруюць у беларускіх замовах, яскрава рэпрэзэнтуюць для даследчыка два прынцыпова адрозныя пласты культуры, то ўласна для вясковага знахара яны выступаюць як раўнапраўныя аператары, кожны з якіх рэалізуе сваю задачу ў цэльным механізме рытуальнай нейтралізацыі ці ліквідацыі хваробы" [6, с.74].

5. Знахар і рамяство. Як ужо неаднаразова адзначалася ў этнаграфічнай літаратуры, у народнай свядомасці знахарства часта збліжаецца з рамяством, што аб'ядноўвае знахара з павітухай, кавалём, пастухом, пчаляром, музыкам, млынаром ды іншымі ўладарамі прафесійных ведаў. "Быў у нас такі Мікола, каваль, к яму хадзілі, як карова малака не дась. І я хадзіла, ён шаптаў, а Бог яго ведаець, што. Ці ён казаў, як той: Жыў будзеш тут, памрэш, жыў будзеш, там…"[31]. Варта прыгадаць, што і Менеск у паданні названы менавіта знахаром[32]**.** Яго магічная здольнасць рабіць хлеб (муку) з каменя сведчыць аб прыналежнасці Менеска да іншасвету. На Падняпроўі расказалі пра асабліва моцнага знахара, які меў і прафесійны занятак – ладзіць і чысціць ружжы. "Баба радзіла первага мальчыка, ён пакрычэў, пакрычэў і памёр. Пасаветавалі ей пріехаць сюды ў Каласоўку. Дзед атходчык там. Мы пріехалі. А яго нявестка печ натапіла, насьцяліла достак, зьліваець кружачку на бакі і мыець гэтага дзеда. Паріць у печы. Сечас выпарюць? – січас вон выпарюць. Наш дзед памог таго выцягнуць, абдалі яго, надзелі. Ён усё ухаў, ухаў. "Ну што вы, дзетачкі?" І на нявестку: "Ідзі, дзетачка, у крінічку і засілі ряжечкай вады. Толькі што засіліш, тое і нясі, штоб не балтала там". Яна прішла, прінесла, ён запаліў 12 сьвечак. І гаворіць: "Дзеткі, у вас атабраны дзеці". І гаворіць: "жэншчына чорная, яна не зла ніякага, яна проста павучылась – ці палучыцца. Ну ка мне не хадзіце і не прасіце, ад мяне помашчы ня будзіць. Памагець чалавек на усход сонца, чорны чалавек вам памагець. А я нічога". Пріехаў сюды нейкі чалавек, а эта аказаўся дажа нейкі росцьвеннік. Баба ткець кросны, а сьвякрова зайшла ў хату, а ў іх яшчэ мальчык нарадзіўся і памёр. І кажаць: "Ріпіна, ідзець чалавек, што ружжы чысьціць, ідзець па дзяреўні. Пайду я". Прышоў ён і гаворіць: "Знаеш што, маладзіца, той мяне перемагець, хто на небе зьвёзды сымець. Я памагу, толькі тым, што я захапіў, тыя будуць жывы, а крічэць будуць не сваім матам. Плакаць". І асталася шэсь дзяцей. Адхадзіў. – *Чысьціў ружжы і ўмеў лячыць?* – Да, да. Чарнавалосы"[33].

<u>Знахар – музыка.</u> Не падаецца выпадковым і суаднясенне знахарскіх ведаў з музычным талентам, перадусім з валоданнем музычнымі інструментамі. "Тут далекавата былі музыканты, вадзіў бацька хлопчыка, можа, спужаўся, вадзілі да тых Рабінаў. Даў вады і памагло. Яны ігралі хадзілі, і нейкі хлапец ім пакамандаваў. І ім не панаравілася. І гэтыя музыканты зрабілі яму так, што ён да раніцы танцуво**ў**. Так падрабілі. Усё адно яны ігралі. А ён танцувоў. – *Ён мог і вылечыць і зрабіць такое?* – Ну да. Умеў. Алі яны ўмелі, алі так людзям благога нічога не рабілі, а ўмець умелі"[34]."Іх раней было тры браты. Адзін на балалайцы іграў, другі ў дуду. Васіль у дуду, а Міхалка быў на скрыпцы. Як зберуцца тут у нашым канцы. Гэта цяпер дзярэўня малая. Як прыдзе свята ці Вялічка, ці Троіца. Як выйдуць, як зачнуць іграць усё сяло тады сюды збіраецца" [10, с. 78].

6. Сацыяльныя аспекты статусу знахара. Апеляцыя да пажылога ўзросту як статуснаму атрыбуту паказвае на асаблівую ролю гэтага віду сацыяльнага капіталу ў фарміраванні даверу да лекараў. "У нас быў дзед Архіп, царства яму Нябеснае, ужо ўмер, ён жыў 103 гады. Но еслі ён палечыць..."[35]. Нягледзячы на паважны ўзрост, знахар застаецца дужым фізічна, што гэтаксама выступае адной са статус-

[30]Зап. у 2009 г. Філіпенка У. у в. РачныяДокшыцкага р-наадПрацукевічАлеиыАляксееўны, 1932 г.н.
[31]Зап. у 2006 г. Боганева А. і Валодзіна Т. у в.Сталюгі Лепельскага р-на ад Кузьміч Соф'і Пятроўны, 1934 г.н.
[32]Незразумелым з'яўляецца пераклад у сучасных выданнях слова "знахарь", якое ўжываецца ў першакрыніцы і мае ў народнай культуры пазітыўнае напаўненне, тэрмінам "чараўнік", які, апрача станоўчых, мае і скрайне негатыўныя канатацыі [8, с. 393].
[33]Зап. у 2012 г. у в. Ветка Хоцімскага р-на адЛагуновай Таісіі Кузьмінічны, 1939 г.н.
[34]Зап. у 2009 г. у в.Грундзішкі Маладзечанскага р-на ад Маліноўскай Марыі Рыгораўны, 1933 г.н.
[35]Зап. у 2009 г. у в. СцяпыЖлобінскага р-на адШаўцовайВалянціныСяргееўны, 1936 г.н.

ных характарыстык. “Ну ўлічнае так было яго, звалі Борах, ну бароўсі ён, быў крэпкі. Дужы такі. Да, дужы, ён у арміі быў у марфлоці і з мядзведем бароўсі. Мядзведзя пабядзіў. Вот яму далі – Борах”[36]. “У яго быў жонкі дзед Харытон. Кажуць, што ён чараўнік быў. Стары-стары. Якое дзерава ў лесе не ссячэ — на плечы і нясе. А кажуць: “Яму чортава сіла нясе”, патаму што ён жа стары”[37].

Менавіта ў дачыненні да знахароў-мужчын падкрэсліваецца датычнасць да гісторыі, насычанай суровым вопытам падпрольнага лекавання, рэпрэсій і пераследу з боку афіцыйнай медыцыны і нават уладаў. “…А ваду паставіла на тумбачку. Прышоў врач і пытаецца: “Што эта ў цябе?” –“Сьвяцкі, -- кажа…(мая фамілія па бацьку Сьвяцкі) даў ваду”. Яны за гэту ваду, правяралі, што яны зь ёй. А там нічога німа, вада і вада. Божае ж слова там не плавае. Ну што ж: прыехалі, забралі і пасадзілі. Алі бацька нямнога сядзеў. Эта ў 50-м годзе, яшчэ Сталін жыў. Вот так было. Бацька ўсіх лячыў. І буйнае памішанія лячыў”[38].

Істотным падаецца і падкрэсленне гаспадарлівасці знахара, яго ўменне весці гаспадарку, працавітасць, парадак і лад на падворку. Ва ўсялякім разе звесткі пра нядбайнага знахара-гаспадара не прыгадваюцца. Першая трэць XX стагоддзя пакінула па сабе памяць як час раскулачвання і ўжо праз тое разбурэнне ўстойлівых сялянскіх гаспадарак, сярод якіх узгадваюцца і гаспадаркі знахароў. “Да, пры савецкай власці яго таксама раскулачылі. Выгналі са сваёй хаты. Пасялілі, далі маленькую. Раньше чарадзейства было сільна строга, гэта цяпер сталі і травамі. А раньше гэта дужа запрашчалася. К яму прыхадзілі хто забалеіць, там прынясуць што. Гаварылі, вот ты ўжо нясеш, што там ў цябе сала ці чагонебудзь атблагадарыць. І еслі ты будзеш нясці і пажалеіш. “Лучше я астаўлю, пайду што там”. Всё раўно прыдзіш – будуць адны чэрві. Расказвалі. Так, што сіла ён быў”[39]. Аднак нельга не адзначыць асаблівай абазнанасці знахара ў гаспадарчых справах, праз лучнасць яго з прыроднымі сіламі. “У нас быў такі чалавек, Кужа зваўся, дужа знахар вялікі, дак ён скажэць: "Не выганяйце кароў, пакуль я не скажу…" Ён пройдзець па дзярэўні, пугай ляснець, тады выганяюць. А тады скажэць: "Не зажынайце бабы жыта, пакуль я ня выйду і не зажну", і ніхто не ішоў, усе баяліся, ну ён нешта знаў. Як ён выйдзець жаць, тады ўжэ і ўсе ідуць, а ён скажэць: "Ну ідзіце ўжэ, зажынайце, я зажаў, хай Бог Вам дае шчасліва пажаць" і ўсе пачынаюць жаць. Гэта за ракой быў такі старык, даўно памёр. Ён лячыў і памагаў, уреду ён дужа не робіў, хвалілі яго. Так яго слухалі ўсе, нясуць яму ўсяго…, просяць: "Дзядулька, жыта сыпецца, нада зажынаць… – Ну пайду зажну, што ж зробіш…", дзяржаў усю вёску ў руках”[40].

Пры стварэнні сацыяльнага партрэту вясковага носьбіта таемных ведаў часта скарыстоўваюцца і такія статусныя паказальнікі, як прыналежнасць да іншай веры, сацыяльнай групы, нацыянальнасці. “Ну і гэтак ён крычаў бедны дзень-ноч. Гвалт! Дзень-ноч я не спаўшы. Тады мне бабка параіла, кажаць: “Схадзіце вы…”, а такі татарын быў жыў. Ну я пайшла да яго. Сразу спрасіў, ці хрышчоны ён. Кажаць: “Калі хрышчоны, то паможаць, а есьлі ён нехрышчоны… ” Я кажу: “Хрышчаны.” І ён мне тры раза яго загаварыў і ўсё – стаў спаць нармальна, усё… Ён вады даваў, ён загаварываў над ім. Лажыў воўну нейкую, шэрсць, на жывоцік, гэты татарын, і шаптаў яму”[41]; “Быў такі пан Палонскі. Дзед пашоў к пану. Пан раскрыў кнігу і на яго: “Што ты ка мне прышоў, як ужо ў яе канец жызні?” – “Я ж не знаў! Пяць дзяцей у нас”. – “Ей здзелана пры вясёлай пірушцы на чарку гарэлкі. Вот табе вады, бяжы скарэй”[42]. Шмат запісана пра знахароў-стараверaў на Браслаўшчыне. Гэтыя рысы арганічна аб’ядноўваюцца семаю “чужога” і выступаюць.

Цікава, што пра знахароў, у адрозненне ад чараўнікоў, практычна не фіксуюцца класічныя былічкі, мемараты, у якіх бы фігуравалі чэрці, чорная кніга ці штось падобнае, а ўся інфармацыя перадаецца ў тэкстах так званага вуснага дыскурсу, у пераказах чутак, павер’яў, у якіх шукаюцца прычыны няшчасцяў і хвароб, тлумачацца асаблівасці знешнасці ці паводзінаў меркаванага ведуна. Адчуваецца неабходнасць і псіхалагічнага плану. Сацыяльная роля самога інстытута знахарства мае цалкам прагматычныя задачы і функцыі змякчэння напругі асобных членаў вясковай грамады, мадэлявання паводзінаў і нават структурызацыі сацыяльных адносінаў.

---

[36]Зап. Лобач У. у 2007 г. у в. Маргавіца Докшыцкага р-на ад Ставера Віктара Андрэевіча, 1929 г.н.
[37]Зап. Боганева А. у 2007 г у в. Бобр Крупскага р-на ад Прыстромавай Вольгі Андрэеўны 1936 г. н.
[38]Зап. у 2009 г. у в. Путчына Дзяржынскага р-на ад Крыловіч Юзэфы Станіславаўны, 1932 г.н.
[39]Зап. у 2008 г. Валодзіна Т. і Лобач У. у в. Добрыгоры Бешанковіцкага р-на ад Лужніковай Фаіны Дзмітрыеўны, 1927 г.н.
[40]Зап. Басько В.І. ув. Жоўніца Шаркаўшчынскага раёна адПадабыцько Алены Антонаўны, 1922г.н.
[41]Зап. Лобач У. у 2008 г. у в. Дзікева Шаркаўшчынскага р-на (інтэрнат) ад Радзішэвіч Вікторыі Станіславаўны (нар. у в. Навасельцы) 1936 г.н.
[42] Зап. у 2002 г. у г. п. ВулаБешанкавіцкага р-наадБаранавайІрыныПарфенаўны, 1914 г н.

ЛІТАРАТУРА

1. Ганчар, У.А. Эвалюцыя знахарства ў Беларускім Палессі ў XX – пачатку XXI ст. : дыс. … канд. гіст. навук. 07.00.07 / У.А. Ганчар. – Мінск, 2013. – 128 с.

2. Христофорова, О.БДискурс о колдовстве и локальные фольклорные традиции: семантика, прагматика, социальные функции : автореф. дис…. докт. филол. наук 10.01.09 / О.Б. Христофорова. – М., 2010. – 46 с.

3. Labouvie, Eva. Männer im Hexenprozess. Zur Sozialanthropologieeines "männlichen" Verstandnisses von Magie und Hexerei / Eva Labouvie // Geschichte und Gesellschaft. – 1990. –Bd. 16.–Heft 1. – S. 56–78.

4. Federowski, M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej: materyały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1894: w 3 t. / M. Federowski. – Kraków : Wyd-wo Komisii antropologicznej akademii umiejętności, 1897–1903. – T. 1: Wiara, wierzenia: przesądy ludu z okolic Wołkowyska, Słonima i Sokółki. – 1897. – 510 s.

5. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч ; уклад., прадм. У. Васілевіча; пер. з пол.. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 670 с.

6. Лобач, У.А. Міф. Прастора. Чалавек : традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 510 с.

7. Народная міфалогія Гомельшчыны : фальклор.-этнагр. зб. / уклад., сістэматыз., тэкстал. праца, уступ. арт., рэд. І.Ф. Штэйнер, В.С. Новак. – Мінск : Нёман, 2003. – 319 с.

8. Крачковский, Ю. Очерки быта западнорусского крестьянина / Ю. Крачковский // Виленский сборник. – Вильна : Издал В. Кулин, 1869. – С. 160–209.

9. Народная демонология Полесья: публикации текстов в записях 80–90-х гг. XX века : в 4 т. / сост.: Л.Н. Виноградова, Е.Е. Левкиевская. – М. : Языки славянских культур, 2010. – 648 с.

10. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 368 с.

11. Полацкі этнаграфічны зборнік / склад.: У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006 – 2011. – Вып. 1 : Народная медыцына Падзвіння: у 2 ч. – Ч. 1. – 2006. – 147 с.

УДК 81'373.21

ТАПАНІМІЧНЫЯ СВЕДЧАННІ РАЗВІЦЦЯ МЛЫНАРСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XV–XIX стст.*

кнад. гіст. навук Ю.І. ВНУКОВІЧ
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск

Прадстаўлены сістэмны аналіз тапонімаў з улікам лінгвістычных і экстралінгвістычных фактаў, які дазваляе высветліць пэўныя заканамернасці развіцця млынарства на тэрыторыі Беларусі ў XV–XIX стст.

Тапонімы маркіруюць разнастайныя праявы чалавечай дзейнасці ў яе цеснай узаемасувязі з прыродным і культурным ландшафтам пэўнай тэрыторыі. Асаблівы след у тапаніміі многіх краін свету пакінула вытворча-прамысловая дзейнасць людзей, якая ажыццяўлялася ў розныя перыяды гісторыі.

У тапаніміі Беларусі адлюстраваны многія гістарычныя назвы вытворчых прадпрыемстваў, якія дзейнічалі на беларускіх землях яшчэ ў перыяд XV–XIX стст. Гэта так званыя *вытворча-прамысловыя тапонімы*, якія ў айчыннай тапаніміцы прынята вылучаць у асобную падгрупу тапонімаў, матываваных назвамі вытворчых і прамысловых аб'ектаў. Яны з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння як сацыяльна-эканамічнай гісторыі, так і асаблівасцей развіцця матэрыяльнай культуры Беларусі ў XV–XIX стст. Апрача таго, менавіта тапонімы дазваляюць дакладна лакалізаваць, а часам і высветліць існаванне ў мінулым пэўнага вытворчага прадпрыемства, не засведчанага ў пісьмовых крыніцах.

Найбольш яскрава ў тапаніміі Беларусі прадстаўлены геаграфічныя назвы, утвораныя ад назваў вытворчых комплексаў, якія размяшчаліся ў сельскай мясцовасці ў маёнтках феадалаў XV–XIX стст. Асобнай інтэрпрэтацыі патрабуюць урбонімы, паколькі прынцыпы намінацыі геаграфічных аб'ектаў у гарадской прасторы маюць сваю спецыфіку. Варта таксама ўлічыць, што гістарычныя назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў Беларусі былі амаль цалкам страчаны на працягу XX ст. у выніку татальнага перайменавання. Таму сучасныя тапонімы Беларусі, матываваныя гістарычнымі назвамі вытворчых прадпрыемстваў XV–XIX стст., у найбольшай ступені адлюстроўваюць развіццё розных відаў

* Артыкул падрыхтаваны ў межах выканання праекта БРФФД № Г13М-110 "Тапанімічныя маркеры культурна-гаспадарчага асваення тэрыторыі Беларусі".